# ШКОЛЬНАЯ ПЛАНЕТА

**НЕ БУДЗЬ ЧУЖЫНЦАМ НА СВАЁЙ ПЛАНЕЦЕ!**

***№ 6 (71) ЛЮТЫ 2021***

**Выданне ДУА "Сярэдняя школа № 2 г. Беразіно"**




## *Сёння ў выпуску:*




**Прызнаемся Школе ў любові**






**дом,
дзе ўтульна ўсім**



**Лепшая каманда
па выніках раённай алімпіяды
па правілах дарожнага руху**



**# 6**

**Тыдзень
пачатковых класаў:
цікава і захапляльна**

# Ведаюць законы дарог на ўсе 100%

**Лепшай па выніках раённай алімпіяды па правілах дарожнага руху стала каманда нашай школы ў складзе Лапцёнка Арцёма, Самца Мікіты і Андрэева Данілы пад кіраўніцтвам Таццяны Мікалаеўны Зелянкевіч. Акрамя таго, дыпломам пераможцы ў асабістым заліку сярод вучняў 7-х класаў узнагароджаны вучань нашай школы Арцём Лапцёнак. Даведаемся ў хлапчукоў пра асабістыя захапленні, пра што яны мараць, чым цікавяцца.**

## БЛІЦ-АПЫТАННЕ

### ЛАПЦЁНАК АРЦЁМ



Дэвіз: **Паважай людзей і тады людзі будуць паважаць цябе.**
Галоўнае захапленне **маляванне**.
Сакрэт паспяховага ўдзелу ў конкурсе: **Калі хочаце, дапамога вышэйшых сіл, штодзённыя заняткі, поспех і веды.**
Любімы колер **бірузовы.**
Любімая пара года **Зіма.**
Любімая страва **Пельмені.**
**Люблю кіно, магу некалькі раз глядзець Мсціўцы: вайна бясконцасці.**
**Шчасце для мяне – гэта жыццё.**
**Чаму я аддаю перавагу? Вучобе.**
Здзівіць, узрадаваць і раззлаваць мяне можа **родная сястра.**
Першае і самае галоўнае правіла пешахода - **Быць уважлівым!**
**Самы яркі ўспамін у жыцці** звязаны з нашым класам, у якім увесь час што-небудзь здараецца.
**У сучаснай школе я б хацеў,** каб у пэўным узросце, напрыклад, ужо ў 7 класе вучні маглі самі выбіраць прадметы, якія яму патрэбныя. Яшчэ хацелася б, каб узнавіў працу школьны буфет.
**У школе будучага** папяровыя кнігі заменяць планшэты. Магчыма, будуць скарочаны гады навучання.
**Калі б я сустрэў іншапланетную істоту, што б я расказаў ёй?!** Я б хутчэй пабег дахаты :))
**Мой учынак, якім я ганаруся…** Разам з сябрамі я дагледжваў усе лета беспрытульную кошку, якую мы кармілі і зрабілі ёй хатку.
Любімае месца ў Беразіно – **мой родны дом.**
Што пажадаць чытачам газеты ?! **Чытаць яе!**

**Цікавілася захапленнямі пераможцаў Яна Морская**

### САМЕЦ МІКІТА



Маё галоўнае захапленне **камп'ютар.**
Любімы колер **аранжавы.**
Любімая пара года **восень.**
Мне да спадобы **луста хлеба.**
**Люблю і кіно, і музыку.**
Самое галоўнае правіла пешахода **паглядзець направа і налева пры пераходзе праязной частцы.**
**У школе будучага** будзе шмат новых прадметаў.
**Чытачам газеты пажадаю поспехаў і здароўя!**






**даведвацца на ўроках шмат новага і цікавага**

# «ШАГ»: ЯШЧЭ АДЗІН ЦІКАВЫ КРОК

4 лютага **ў рамках рэспубліканскага праекта «ШАГ» прайшоў адзіны дзень інфармавання** для вучняў 10-11 класаў у форме адкрытага дыялогу **па тэме: "Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь: на варце бяспекі і суверэнітэту"** з удзелам намесніка міністра па надзвычайных сітуацыях Беларусі А.М.Юржыца і намесніка начальніка Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Б.У.Свірыдовіча, выпускніка 1996 года нашай школы, начальніка Бярэзінскага РАНС М.У.Андрыевіча, выпускніка 1984 года, а таксама начальніка ўпраўлення па адукацыі, спорце і турызме Бярэзінскага райвыканкама А.А.Цітовай.





Дырэктар установы адукацыі С.В.Абрамовіч распавяла пра навучальную ўстанову і тых выпускнікоў, якія сталі гонарам школы, у тым ліку прысвяцілі сваё жыццё службе ў МНС.

Ганаровых гасцей сустракалі юныя ратавальнікі з **клуба «Сірэна».** Удзельнікі клуба расказалі, як дапамагаюць дарослым выратавальнікам эфектыўна навучаць людзей мерам асабістай бяспекі, прадэманстравалі перад гасцямі свае практычныя веды і ўменні, якія атрымліваюць на занятках.










**разам цудоўна праводзіць час на свежым паветры і ўдзельнічаць у спартыўных спаборніцтвах**




У рамках рэспубліканскага праекта «ШАГ» настаўнікі распавялі пра сістэму Узброеных сіл Рэспублікі Беларусь, увязаўшы тэму праекта са службай выратавання Беларусі. Вучням быў паказаны іміджавы відэаролік «Пражыць адно жыццё – выратаваць тысячы» і прафарыентацыйны фільм пра Універсітэт грамадзянскай абароны МНС Рэспублікі Беларусь.



Затым старшакласнікі змаглі задаць свае пытанні. Закранулі асаблівасці паступлення ў ВНУ, цікавіла рабят і як прайшлі школьныя гады гасцей. У завяршэнні сустрэчы яе ўдзельнікі выказалі ўзаемную ўдзячнасць за цікавую размову, станоўчыя эмоцыі і карысную інфармацыю.








**калі побач з табой надзейныя сябры**






# ТЫДЗЕНЬ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ: ЦІКАВА І ЗАХАПЛЯЛЬНА




**З мэтай павышэння цікавасці вучняў да вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, стварэння ўмоў, спрыяльных атрыманню якаснай адукацыі кожным вучнем у адпаведнасці з яго індывідуальнымі здольнасцямі, схільнасцямі і магчымасцямі, ва ўстанове адукацыі з 22 па 27 лютага 2021 года праходзіў «Тыдзень пачатковых класаў».**





**заўсёды цікавыя мерапрыемствы**

Першы дзень тыдня прайшоў пад дэвізам **"Не проста ў словы я гуляю - на мове роднай размаўляю»** і быў прысвечаны Міжнароднаму дню роднай мовы. Вучняў 2 «А» класа паклікаў на сустрэчу любімы шматлікімі дзецьмі часопіс "Вясёлка", старонкі якога рабяты з задавальненнем чыталі. У гэты дзень у час правядзення літаратурнай гасцёўні «Слова наша роднае» у 4 «В» класе і конкурсу чытальнікаў ў 4 «А» класе гучалі лепшыя паэтычныя і празаічныя радкі, прысвечаныя роднай мовы, культуры і гісторыі Беларусі.

Займальныя мерапрыемствы другога дня прайшлі пад дэвізам **«Если ты хочешь судьбу переспорить, Если ты ищешь отрады цветник, Если нуждаешься в твердой опоре – Выучи русский язык!»** Вучні 3 «Б» класа адправіліся ў падарожжа па краіне «Арфаграфія», першакласнікі сталі ўдзельнікамі гульні са словамі «Цудоўныя ператварэння слоў» і наведалі «Кніжнае царства - мудрае дзяржава» – школьную бібліятэку.

Трэці дзень праходзіў пад дэвізам **«Считайте, ребята, скорее считайте. Хорошее дело смелей умножайте, Плохие дела поскорей вычитайте. Скорее работу свою начинайте!»** і быў прысвечаны царыцы навук "Матэматыцы". Вучні 2 «Б» класа сталі ўдзельнікамі квэст-гульні «У краіне лікаў і знакаў». Тры каманды 3 «А» класа змагаліся за права быць лепшай камандай на матэматычным турніры, а дзве каманды вучняў 1 «А» класа спаборнічалі ў час правядзення гадзіны вясёлай матэматыкі**.**

У час школьных перапынкаў праходзіў шахматна-шашачны турнір сярод вучняў 2-4 класаў, якія прадэманстравалі цікавую гульню, праявілі спрыт, логіку, уменне пралічваць крокі суперніка.



У чацвер, чацвёрты дзень, які праходзіў пад дэвізам **«Ужасно интересно все то, что неизвестно! Ужасно неизвестно все то, что интересно!»,** вучні змаглі праверыць сваю эрудыцыю, веды ў розных сферах навукі і мастацтва, праявіць свае лепшыя якасці: кемлівасць, шпаркасць рэакцыі, кемлівасць і настойлівасць. У гэты дзень у 4 «Б» класе прайшла інтэлектуальная гульня «Хачу ўсё ведаць», у 2 «В» класе конкурсна-гульнявая праграма «Разумнікі і разумніцы». Каманды 2 «А» класа «Разумнікі», «Знайка» і «Почемучка» спаборнічалі ў конкурсе эрудытаў. Хлопцы 1 «Б» класа інтэграванага навучання і выхавання прынялі ўдзел у гульнявой праграме «Гукі і літары».








**смачныя сняданкі і абеды ў школьнай сталовой**

**ЯШЧЭ БОЛЬШ ФОТА МОЖНА ЎБАЧЫЦЬ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ СКАНЕРА QR-КОДАЎ**



У пятніцу прайшла ўрачыстая лінейка, на якой былі адзначаны пераможцы і самыя актыўныя ўдзельнікі мерапрыемстваў.

У суботу, заключны дзень Тыдня, на першым школьным фестывалі «Я-даследчык» прадставілі свае працы Лапыцька Ксенія, Белавус Надзея, Сядоў Аляксей, Славашэўская Ганна. Вучні 3-4 класаў не толькі ўважліва слухалі юных даследчыкаў, але і задавалі ім пытанні.




**Аўтар намеснік дырэктара М.Л.Несцяровіч**

# “СЯБРУЕМ З ЗАКОНАМ”

**У перыяд з 10 па 20 лютага 2021 года ва ўстанове адукацыі была праведзена прафілактычная акцыя “Сябруем з Законам” у рамках якой былі праведзены прафілактычныя і інфармацыйна-асветніцкія мерапрыемствы з вучнямі, педагогамі і законнымі прадстаўнікамі.**

10 лютага адбылася **інструктыўна-метадычная нарада класных кіраўнікоў «Арганізацыя і метадычнае суправаджэнне прафілактычнай акцыі “Сябруем з Законам”.** Быў агучаны план асноўных мерапрыемстваў па прафілактыцы безнагляднасці, правапарушэнняў, п'янства, наркаманіі сярод непаўналетніх, па абароне правоў і законных інтарэсаў дзяцей у Бярэзінскім раёне, а таксама прааналізавана работа ў гэтым кірунку ў нашай установе адукацыі за 12 месяцаў мінулага года.

У час **акцыі «Закон + Я = Дружба»** вучні 10-11-х класаў распаўсюджвалі памяткі, інфармацыйныя буклеты па прафілактыцы шкодных звычак, залежнасці ад сучасных гаджэтаў: «Кідаю паліць самастойна - 5 крокаў да поспеху», «Я не палю і гэта выдатна», «Моладзь і наркотыкі», «Даць шанец здароўю можаш толькі ты!», «Прафілактыка наркаманіі»; «Камп'ютарная залежнасць і як яе перамагчы», «Будзь асцярожны ў інтэрнэце» і інш.









З мэтай стварэння ўмоў для актывізацы пазнавальнай дзейнасці вучняў, павышэння ўзроўню прававой культуры, веды вучняў аб правапарушэннях, азнаямлення іх з відамі парушэнняў і пакараннямі за іх **17 лютага былі праведзены інтэрактыўныя заняткі «Займальнае падарожжа ў краіну законаў»** для вучняў 4-х класаў.



**штодзённая праца настаўніка і вучня над адносінамі**





19 і 20 лютага для вучняў 8-х і 10-х класаў педагогам-псіхолагам быў праведзены **інтэрактыўны занятак з элементамі трэнінгу па прафілактыцы падлеткавага булінга “Усе на аднаго”**, у рамках якога былі прадэманстраваны відэафрагменты з кінафільма Ралана Быкава «Пудзіла» пра дзяўчынку Лену Бяссольцаву, якая стала ахвярай агрэсіі і псіхалагічнага ціску з боку аднакласнікаў. Усё гэта пра булінг ў школе - ганенне, запалохванне. Слова - новае, з'ява - старая. Па дадзеных ААН, гвалту ў школе падвяргаецца кожны дзясяты школьнік у свеце, і гэты паказчык штогод расце. На гэту праблему нельга заплюшчваць вочы, бо дзіцячая жорсткасць часам пераходзіць усе дапушчальныя межы.



18 лютага з вучнямі 9-10 класаў адбылася **сустрэча-дыялог з участковым інспектарам ІСН Бярэзінскага РАУС Сахончык А.А. «Прафілактыка правапарушэнняў і злачынстваў сярод непаўналетніх».** Анастасія Алегаўна асвятляла пытанні аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці непаўналетніх за ўчыненне злачынстваў і правапарушэнняў. Падлеткам было растлумачана, з якога ўзросту наступае крымінальная адказнасць і якія пакарання прымяняюцца за ўчыненне злачынстваў. Таксама ўчастковая закранула пытанні паводзінаў вучняў ва ўстанове адукацыі і грамадскіх месцах, паважлівага і карэктнага стаўлення школьнікаў да настаўнікаў, дарослых і аднагодках. Акрамя таго, быў прадэманстраваны фільм аб непаўналетніх, якія знаходзяцца ў спецыяльных установах за здзяйсненне правапарушэння, і прымушае задумацца над ўчынкамі герояў фільма - маладых хлопцаў, якія вырашылі пайсці незаконным шляхам.

Хочацца спадзявацца, што вучні нашай школы сур'ёзна аднесліся да атрыманай інфармацыі, яны зробяць усё магчымае, каб паважаць закон, людзей, а сваімі добрымі паводзінамі ў грамадстве змогуць заваяваць да сябе павагу.

**Аўтар намеснік дырэктара І.М.Бародзіч**






**калі настаўнік і вучань паважаюць адзін аднаго**



**РАЗВІТВАЕМСЯ З ЗІМОЙ!**
**ЧАКАЕМ ВЯСНЫ, СОНЕЙКА,**
**НОВЫХ УРАЖАННЯЎ І СТАНОЎЧЫХ ЭМОЦЫЙ!**
**ЖАДАЕМ ЧЫТАЧАМ НАШАЙ ГАЗЕТЫ**
**МУДРАСЦІ, ДАБРЫНІ,**
**ПОСПЕХАЎ І МОЦНАГА ЗДАРОЎЯ!**

ДУА “Сярэдняя школа №2 г. Беразіно” 223311
вул. Мультана, 19
Электронная пошта
berezinosch2.edu@tut.by

Сайт школы
berezino2.school.by

Газета “Школьная планета” выходзіць адзін раз у месяц.
Над выпускам працавалі ўдзельнікі клуба “Юны журналіст”:
Бурая Анастасія, Верас Анастасія, Губчэўская Кацярына, Камароўская Ксенія і інш.
Кіраўнік клуба А.Я.Ждановіч